агульнаспецыяльныя дысцыпліны; дысцыпліны спецыялізацыі.

Блок агульнанавуковых дысцыплін забяспечвае фундаментальную універсітэцкую падрыхтоўку кадраў. Яго аснову складаюць наступныя вучэбныя дысцыпліны: філасофія,паліталогія, эканоміка, эстэтыка, гісторыя, літаратура, якія будуць вывучацца ў рамках універсітэцкіх праграм. Агульнавядома, што бібліятэкар з'яўляецца пасрэднікам між дакументам і карыстальнікам. Гэта патрэбуе ад яго ведаў, якія дазваляюць разбірацца як у змесце дакументаў, так і ў асаблівасцях чытачоў і працэсу ўспрымання інфармацыі.

Другі блок - дысцыпліны, якія вывучаліся да паступлення ў ВНУ: "Машынапіс";"Камп'ютэрны практыкум"; "Замежныя мовы"; "Імідж дзелавога чалавека".

Трэці блок можна назваць "Агульнапрафесійныя дысцыпліны", ён павінен уключаць, у першую чаргу, чатыры агульнапрафесійныя тэарэтычныя дысцыпліны: "Бібліятэказнаўства"; "Дакументазнаўства"; "Бібліяграфазнаўства"; "Інфарматыка".

Веды, якія атрыманы студэнтамі ў выніку вывучэння дадзеных вучэбных курсаў, павінны стаць тэарэтычнай базай для далейшага засваення спецыяльных ведаў. Гэтыя веды студэнты атрымаюць у выніку вывучэння наступных асноўных спецыяльных курсаў: "Бібліятэчны фонд" (або "Тэкставыя базы дадзеных"); "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў"; "Знешнія і ўнутраныя бібліяграфічныя базы дадзеных"; "Абслугоўванне карыстальнікаў"; "Бібліятэчны мэнеджмэнт і маркетынг".

З мэтай устаранення дубліравання дысцыпліны трэцяга, як і першага, блокаў павінны чытацца з улікам спецыялізацый, выбраных студэнтамі, і ў далейшым будуць дапаўняцца і дэталізавацца на курсах спецыялізацый.

Рэалізацыя выказаных прапаноў вымагае рэарганізацыю структуры факультэта і пераразмеркаванне функцый між кафедрамі. На нашу думку, на факультэце мэтазгодна стварыць наступныя кафедры (на пераходны перыяд): тэорыі і гісторыі бібліятэчна-інфармацыйных сістэм; дакументазнаўства і фондазнаўства (або тэкставых баз дадзеных); аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў і бібліяграфічных баз дадзеных; арганізацыі абслугоўвання карыстальнікаў; бібліятэчнага мэнеджмэнту і маркетынгу.

Грыцкевіч А.П.,
докт.гіст.навук,
прафесар

# ПРАГРАМА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ГІСТОРЫІ

Адной з асноўных гістарычных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах гуманітарнага профілю на Беларусі з'яўляецца гісторыя Беларусі. У Беларускім універсітэце культуры яна, безумоўна, дамінуе сярод іншых дысцыплін у галіне гісторыі.

Выкладанне гэтага, як і іншых прадметаў, вядзецца ў адпаведнасці з праграмай. У свой час, у 1978 годзе, на кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін (як да 1991 г. называлася кафедра гісторыі Беларусі і замежных краін) была падрыхтавана праграма, якая дапамагала не толькі выкладчыку, але і студэнту пры падрыхтоўцы па гэтаму прадмету да залікаў і экзаменаў. У праграме была ўключана і неабходная недагматычная літаратура (для таго часу). Ужо ў сярэдзіне і другой палове 80-х гадоў гэтая праграма стала недастатковай, а ў апошніх яе раздзелах - і састарэлай. А новая праграма не магла друкавацца, бо згодна з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі справа складання праграм па гісторыі БССР належала толькі кафедры гісторыі БССР Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Разам з тым створаная універсітэцкімі выкладчыкамі праграма не прымалася выкладчыкамі кафедры Мінскага інстытута культуры, бо яны лічылі яе дагматычнай, няпраўдзівай і фальсіфікаванай, што пацвердзілі і далейшыя падзеі, як палітычныя, так і навуковыя (асабліва пачынаючы з 1992 года).

Цяпер ва універсітэце культуры намі створана новая праграма. Яна пазбаўлена напластаванняў мінулага перыяду, а яе літаратурная частка - абавязковых прац для вывучэння, прадыктаваных наменклатурай. Новая праграма пашырана ў тэматычным накірунку і мае больш адпаведную гістарычнаму працэсу структуру. Яна абапіраецца на шырокі спіс літаратурных пазіцый, напісана на аснове той гістарычнай канцэпцыі, якую аўтар адстойваў ужо доўгі час і якая лічыцца цяпер нацыянальнай.

Новая праграма па гісторыі Беларусі перш за ўсё грунтуецца на разглядзе гісторыі нашай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

краіны як самастойнай, з далекім, у глыбіні стагоддзяў, і трывалым прынцыпам дзяржаўнасці Беларусі, пачынаючы ад Полацкага і іншых беларускіх княстваў, а таксама Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Праграма, абмеркаваная кафедрай і зацверджаная вучэбна-метадычнай радай універсітэта, паступова разглядае этапы станаўлення і развіцця дзяржаўнасці Беларусі, паказвае неадназначныя дачыненні Беларускай дзяржавы з рознымі краінамі, перш за ўсе з суседнімі.

У праграме няма палемікі з гісторыкамі імперскай школы ў гісторыі Беларусі - ад расійскіх дваранскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў (асабліва Пецярбургскай школы) да савецкіх расійскіх і беларускіх, якія ўсе разглядалі гісторыю Беларусі як часткі Расіі і суадносілі і каменціравалі гістарычныя факты з пункту гледжання, ці карысныя яны былі Маскоўскаму княству, потым царству, Расійскай імперыі і Савецкаму Саюзу, ці не карысныя.

Уся канструкцыя праграмы і яе змест адвяргаюць гэтую, раней пануючую канцэпцыю ад пачатку і да канца.

Праграма па гісторыі Беларусі асабліва звяртае ўвагу выкладчыка і студэнта на гісторыю падзей на Беларусі за апошняе стагоддзе, фактычна паказваючы гісторыю беларускага адраджэння пачатку XX ст., гісторыю Беларускай Народнай Рэспублікі, гады грамадзянскай вайны, савецкі перыяд (БССР), а таксама апошнія некалькі год гісторыі нашай краіны.

Беспалая М.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## СПЕЦКУРС ЯК СРОДАК НОВАГА ПАДЫХОДУ ДА ВЫКЛАДАННЯ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

Вядома, спецкурс - гэта не новая форма навучання. Выкарыстоўваецца яна даўно і з'яўляецца дзейсным сродкам паглыбленага вывучэння вузкай тэматыкі, аб'яднання студэнтаў па агульных навуковых інтарэсах і стварэння на гэтай аснове навуковых школ.

Некалькі другія абставіны вызначаюць увядзенне спецкурсаў для студэнтаў па гісторыі ў нашым універсітэце, таму што гісторыя не з'яўляецца для іх спецыяльнасцю.

У выкладанні сусветнай гісторыі спецкурс павінен стаць адным з распаўсюджаных метадаў, асабліва, калі ўлічваць шматузроўневае навучанне і шматпрофільнасць кафедр. Асноўным зместам спецкурсаў па сусветнай гісторыі павінна стаць знаёмства з духоўным жыццём цывілізацый у розныя гістарычныя эпохі. Безумоўна, ніякі спецкурс не зможа поўнасцю раскрыць духоўнае жыццё канкрэтнай цывілізацыі. Не трэба ставіць мэтай і вывучэнне тых яго накірункаў, якімі займаюцца спецыяльныя кафедры. Спецкурс па гісторыі павінен тычыцца тых эканамічных, палітычных абставін, якія вызначылі канкрэтныя дасягненні ў галіне культуры, разгледзець духоўнае развіццё пэўнай сацыяльнай групы. Такая накіраванасць дае магчымасць улічыць патрэбы кожнай спецыялізацыі, наладзіць больш цесныя кантакты са спецыяльнымі кафедрамі.

Напрыклад, для студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм у спецкурсе можна рабіць акцэнт на развіццё бібліятэк у канкрэтных гістарычных абставінах, на ўплыў духоўнага жыцця на бібліятэчную справу. У спецкурсе можна выкарыстаць больш шырокі гістарычны матэрыял, навуковую літаратуру, найноўшыя даследаванні па тэме. На лекцыі немагчыма разгледзець падрабязна ўсе пытанні, ды можа ўсім студэнтам гэта і не патрэбна, а спецкурс будуць наведваць толькі зацікаўленыя людзі, што дазволіць уключаць у яго самы разнастайны матэрыял.

На бібліятэчным факультэце можна прапанаваць некалькі спецкурсаў, напрыклад "Духоўнае жыццё старажытных цывілізацый свету", "Духоўнае жыццё сярэднявечча" і інш. Гэтыя спецкурсы дазволяць паказаць развіццё бібліятэчнай справы ў глыбокай сувязі з сацыяльным, эканамічным і палітычным развіццём абранага перыяду. Ва універсітэцкай бібліятэцы маецца шмат добрай літаратуры, асабліва па старажытнаму перыяду, і можна карыстацца цікавымі крыніцамі, знаёміцца з некаторымі замежнымі навуковымі працамі, у якіх па-новаму разглядаецца гісторыя духоўнага жыцця чалавечай цывілізацыі.

Увядзенне спецкурсаў дае магчымасць арганізаваць сумесна з кафедрамі падрыхтоўку курсавых і дыпломных работ. Спецкурсы, як мы адзначалі, наведваюць толькі зацікаўленыя людзі, таму з імі можна распрацаваць тэматыку курсавых работ, а пачаткам гэтай работы можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ